*УДК 398.4:133.3(=161.3)*

**А. Д. Дакукін**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# МАГІЧНАЕ КОЛА Ў ВАРОЖБАХ БЕЛАРУСАЎ

У дадзеным артыкуле на багатым фактычным матэрыяле даследуецца мадэль свету (кола) як надзвычай важны феномен у традыцыйнай культуры. Аўтар, аналізуючы тэксты варожбаў, выяўляе ў іх змесце прадметныя атрыбуты, рытуальныя дзеянні, якія суадносяцца з ідэяй магічнага кола.

Варажба – гэта адметная з’ява ў жыцці беларусаў. Вялікай памылкай будзе лічыць яе прымхамі і забабонамі, бо мантыка дапамагала чалавеку нібы зазірнуць у далейшы час і прадказаць самыя разнастайныя падзеі – ад летняга надвор’я і будучага ўраджаю да тэрміну вяселля і працягласці жыцця. Нарэшце, варажба (асабліва звязаная з каханнем) несла ў сваіх рытуалах і адбітак гульні, з’яўляючыся вельмі прывабнай забавай для моладзі.

Даследчык У. Васілевіч, аналізуючы тэксты варожбаў, прыкмет і павер’яў, надае значэнне такім іх важным складнікам, як час, месца, колькасць удзельнікаў, выкарыстанне разнастайных рэчаў і выкананне пэўных адмысловых дзеянняў [1]. Звяртае ён увагу і на даволі распаўсюджаны вобраз кола, звязаныя з якім уяўленні найбольш яскрава выявіліся ў любоўнай мантыцы.

Кола і круглыя прадметы нездарма маюць цесную сувязь з каханнем, вяселлем і сямейным жыццём, бо, як сцвярджае вядомы даследчык славянскай міфалогіі Т. Шамякіна, «выява агню, сонца, а таксама сям’і – круг (адсюль пярсцёнкі жаніха і нявесты, вянцы ў абрадзе вянчання). У крузе пануе згода. Круг – генатып сям’і ў індаеўрапейскіх народаў» [2, с. 77].

Зыходзячы з прааналізаваных намі тэкстаў беларускіх варожбаў, кола, якое можа выступаць як у выглядзе уласна круглых прадметаў (хлеб, вянок, пярсцёнак), так і быць схематычным увасабленнем-сімвалам круга (абкручванне чагосьці ніткай, абыход вакол нейкага месца), разам з пэўнымі рэчамі ды зёлкамі набывала, паводле меркаванняў продкаў, сапраўды моцную магічную сілу. Вось як, напрыклад, згодна з фактычным матэрыялам адбываліся рытуалы з выкарыстаннем бліноў, вянкоў і інш., калі імкнуліся даведацца пра выгляд суджанага, з якога боку ён мусіць з’явіцца, а таксама пра тэрмін надыходу вяселля:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Хлеб (бліны, аладкі) – *«Першы блін, які маці спячэць на Багату Каляду на Васілля (г. зн. перад Новым годам), дачка возьмець, пойдзець на крыжавую дарогу, там яго з'есць і слухае, дзе сабакі за- брэшуць: у тую старану выйці замуж»* [1, с. 31]; *«Наважыўшы даведацца, з якога боку будзе нявеста, хлопец уласнаручна пячэ блін, пакрывае ім галаву і адпраўляецца на перакрыжаванне: у якім баку спачатку забрэшуць сабакі, адтуль будзе нявеста. Калі вынік варaж- бы задавальняе, хлопец кідае блін у бок сабачага брэху, у адваротным выпадку – або кідае ў супрацьлеглы бок, або нясе дадому»* [1, с. 34]; *«Сабраўшыся ў адну хату, дзяўчаты пякуць з мукі булачкі велічынёю з курынае яйка, кладуць іх у рад і клічуць сабаку: чыю булачку ён возь- ме першую, тая першая і выйдзе замуж»* [1, с. 42–43]. Цікава адзна- чыць, што ў аднолькавых ці падобных варожбах такога тыпу, запіса- ных на ўсёй тэрыторыі Беларусі, могуць выкарыстоўвацца і бліны, і аладкі, і булачкі, і галушкі (часта салёныя альбо спечаныя з аднолька- вай колькасці вады, солі і мукі), нават проста кавалкі хлеба, што і дае нам падставы аналізаваць падобныя тэксты ў адной групе, а не дыфе- рэнцыраваць іх ў адпаведнасці са спосабам прыгатаўлення страў з мукі: *«Дзеўкі на Шчодры вечар пякуць з жытняй мукі па дзве круг- ленькія бондачкі, на сябе і на свайго каханка, пусціўшы іх на ваду, зва- рушаць, каб хадзіла: калі булачкі, паплываўшы, пастануць пры сябе, то пойдзе за таго, а як не, то не»* [1, с. 52–53]. Хлеб вельмі распаўсюджаны ў якасці прадмета рытуальных дзеянняў, бо ён уяўляе сабой *«найбольш сакралізаваны від ежы, сімвал дабрабыту, шчасця, дастатку. "Як Дар Божы" з'яўляецца ўвасабленнем чалавечай (ка- лектыўнай і персанальнай) долі, карыстаецца асаблівай пашанай і выклікае амаль рэлігійнае стаўленне»* [3, с. 532].

Пярсцёнак – *«На Каляды, на Шчадраца, ставілі стакан з вадою на люстэрка, кідалі ў ваду заручальны пярсцёнак у 12 гадзін, глядзелі ў стакан і чакалі ўбачыць жаніха. Для большага страху ўсё гэта пра- раблялі не ў хаце, а на гарышчы, каля коміна»* [1, с. 50]. Пярсцёнак, які таксама суадносіцца з ідэяй кола, не мае ні пачатку, ні заканчэння, і сімвалізуе бясконцасць сямейнага жыцця.

Яйка – *«Разбівалі сырое яйцо і – плюх – у стакан. Глядзелі: калі паказалася цэрква – дзеўка выйдзе замуж»* [1, с. 52]. Вядома, што яйка дае пачатак новаму жыццю, невыпадкова беларусы верылі, што і новая сям'я, магчыма, дзякуючы выкарыстанню гэтага прадметнага атрыбута, можа стварыцца хутчэй.

Вянок – *«Пасля паўдня хлопцы і дзяўчаты (пры ўмове, што адных столькі, колькі другіх) усе разам выпраўляюцца на луг ля рэчкі*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*ці возера. Прыйшоўшы на выбранае месца, кожны спачатку збірае кветкі і пляце вянок. Потым папарна пускаюць па чарзе свае вянкі на ваду і сочаць, як яны адплываюць. Гэта цнатлівая варажба на свой лёс: разлучэнне вянкоў паказвае на нясуджанасць сумеснага жыцця; калі патоне адзін вянок – смерць; спыніцца вянок і прыстане да другога – не быць у пары з абраннікам ці абранніцай»* [1, с. 64]; *«Чый вянок хутчэй згарыць (на купальскім вогнішчы), тая дзеўка скарэй усіх выйдзе замуж. Хлопцы кідаюцца ў вагонь, каб выхваціць адтуль вянок тае дзеўкі, якая падабаецца. Калі хлопец выхваціць з агню вянок дзеўкі, то яна пакахае яго й выйдзе замуж»* [1, с. 65]; *«У нас заўсёды ўвечары перад Андрэем выліваюць дзеўкі воск ці волава на воду, і калі выльецца вянок, то замуж тая пойдзе, а калі крыж, то ўмрэ»* [1, с. 76]. Як і пярсцёнак, вянок нагадвае бясконцы круг, таму і прадказвае доўгі і шчаслівы шлюб, асабліва, калі ён сплецены з купальскіх зёлак.

Вышэйпрыведзеныя прыклады даюць падставы сцвярджаць, што, кола выступае тут у ролі сродку, які гарантуе спраўджванне чаканага і дапамагае мацней паўплываць на лёс. Зразумела, што сюды дадаецца яшчэ і сіла хлеба, зерня, агню, рытуальных дзеянняў (яны даволі разнастайныя і выкарыстоўваюцца з мэтай дасягнення розных вынікаў, але заўсёды «замацоўваюцца» ў выглядзе кола).

Магічнае кола (дзеянні, якія сімвалізуюць круг) мае на мэце яшчэ і задачу стаць своеасаблівай мяжой для чаго-небудзь (напрыклад, не даць хлопцам ажаніцца з дзяўчатамі з іншых вёсак), а таксама сканцэнтраваць штосьці ў акружанай прасторы: *«Выходзяць на крыжовую дарогу не ў пару (1, 3, 5 чалавек). Абводзяць вакол сябе круг. Адна – у крузе, астатнія – за кругам. Гавораць: “Суджаны- раджаны, падай голас!” Стаяць і чакаюць, дзе што будзе чуваць. У якім баку загудзіць – туды паедзеш, заплача – не ў той час родзіш дзіцё, заіграе – будзе ў цябе ў тым баку вяселле, забрэшуць сабакі – выйдзеш замуж»* [1, с. 32]; *«Варажылі ў суботу перад Раждзяством. Сабяруцца дзеўкі, а хлопцы пілнуюць. Каб дзеўкі замуж не ішлі, яны цягалі мяліцу вакол сяла ці абкручвалі сяло суровай ніткай»* [1, с. 34]; *«На Каляды дзеўкі абносяць шматок старога сала ўкруг вёскі, каб прыманіць хлапцоў»* [1, с. 35];
*«Варожаць на Купалу: у начной сарочцы аббягае дзяўчына тройчы вакол калодзежа і раскідвае мак (імітуе), а потым ідзе ў дом і, ні з кім не гаворачы, кладзецца спаць. Уночы ёй павінен сасніцца жаніх»* [1, с. 65]. Варта прыгадаць прыклады варожбаў, дзе сумяшчаюцца і круглыя рэчы, і рытуальныя дзеянні, якія сімвалізуюць кола, каб

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

узмацніць дзеянне і паскорыць надыход патрэбных вынікаў: *«Дзяўчына пячэ два хлябы, ці "лапуны" з двух напарсткаў мукі і посціць цэлы дзень. Перад сном яна, голая, аббягае вакол дома тры разы, трымаючы ў левай руцэ спечаныя праснакі, а ў правай – льняное насенне, якое пакрысе рассыпае са словамі: "Андрэю! Я лён сею, патурбуйся сказаць, з кім буду сабіраць!" Лежачы ў пасцелі без кашулі, дзяўчына качае па целе ляпёшкі, з якіх адну з'ядае, а другую кладзе пад падушку: уночы абавязкова сасніць суджанага»* [1, с. 72]; *«Напярэдадні Раства, перад Багатай куццёй, дзяўчаты вугалем, дастаным з печы, чэрцяць кола, сыплюць туды зерне і, кідаючы ўсярэдзіну пярсцёнак, клічуць куры. Калі тыя выкінуць пярсцёнак за межы кола, то дзяўчына за год выйдзе замуж»* [1, с. 44]. У апошнім прыкладзе можна ўбачыць узаемадзеянне акрэсленага кола – сімвала своеасаблівай мяжы, зерня – увасаблення жыцця і пярсцёнка, які гарантуе добры шлюб.

Такім чынам, вобраз кола вельмі распаўсюджаны ў народным светапоглядзе. Выступае ён як у выглядзе прадметаў круглай формы, так і ў выглядзе сімвалічнага магічнага кола. Функцыі кола ў варожбах наступныя: паспрыяць паспяховым вынікам магічных дзеянняў, узмацніць уплыў іншых рэчаў, стварыць мяжу для чаго небудзь. Кола, якое не мае ані пачатку, ані заканчэння, – гэта таксама увасабленне пэўнай бясконцасці, вечнасці, таму яно і прагназавала моладзі доўгае і шчаслівае сямейнае жыццё, што можна пацвердзіць выказваннем даследчыцы Т. Шамякінай,
«кругазварот, несупынны, пастаянны, пераход аднаго стану ў другі: жыцця ў небыццё, небыцця – зноў у жыццё. Народная філасофія сцвярджала, што ўсё ў свеце – дабро, бо ўсё – адзінае, ліха-зла не існуе, гэта часовае адхіленне ад нормы, для таго толькі, каб дабро было бачным, каб яго лепш адчуваць...» [2, с. 91]. Калі ж дадаць да магічнага кола магію лічбаў, рытуальныя дзеянні, то акажацца, што варажба і сёння працягвае вабіць людзей нечым няўлоўным.

**Спіс літаратуры**

1 Зямная дарога ў вырай: беларускія народныя прыкметы і павер'і / Уклад., прадм., перакл. і паказ. У. Васілевіча. – Кніга 3. – Мінск: Беларусь, 2010. – 717 с.

2 Шамякіна, Т. Аўтарскі курс лекцый "Славянская міфалогія" / Т. Шамякіна. – Мінск: [б.м], 2005. – 189 с.

3 Беларуская міфалогія: энцыклапедычны слоўнік / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск: Беларусь, 2006. – 599 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ